*Ганна Мікалаеўна Бажко (Вайшэвіч)*

# Мы родам з Палесся

На зямлі не стала незвычайнай, прыгожай, разумнай, з цяжкім жыццёвым лёсам Валянціны Іванаўны Локун, якая ўсё жыццё аддала служэнню роднай літаратуры. І мне, як сяброўцы дзяцінства і юнацтва, хочацца расказаць усім, якой жа была Валянціна, як жыла, чым цікавілася, аб чым марыла, чаго дасягнула ў сваім жыцці.

Нарадзілася яна ў невялічкай ціхай вёсачцы Цепянец Пінскага Палесся. Жыла ў звычайнай сялянскай сям'і. З самага дзяцінства побач з ёю рос старэйшы на два гады брацік Васілёк, які быў яе апорай, абаронай, адданым і верным памочнікам у жыцці. Яна моцна любіла і цаніла брата. Сваю любоў да яго Валя пранесла праз усё жыццё.

У вёсцы была маленькая пачатковая школа. З вялікай радасцю і натхненнем яна бегала ў школу. У першы клас яна прыйшла ўжо падрыхтаванай, бо, калі брат выконваў дамашнія заданні, яна сама каля яго навучылася чытаць і пісаць. У руках у яе заўсёды была кніга. З дзяцінства марыла стаць настаўніцай, заўсёды дапамагала тым, хто адставаў у вучобе. Цаніла дружбу, умела расказвала розныя гісторыі, якія вычытвала ў кніжках сама ці пачула ад старэйшых. У вёсцы Цепянец Валя скончыла чатыры класы. А далей хадзіла ў Малоткавіцкую сярэднюю школу за 7 кіламетраў ад хаты. У вольныя ад школы хвіліны, як і ўсе дзеці, бегала, весялілася, была арганізатарам дзіцячых гульняў і забаў. Але ўсё гэта было толькі да сёмага класа.

Пасля шостага класа Валя не змагла хадзіць у школу. Праляжаўшы доўгі час у бальніцах, праз тры гады яна прадоўжыла адукацыю ў Пінскай завочнай школе. За адзін год скончыла два класы — сёмы і восьмы. Кантрольныя і экзамены ў яе прымалі настаўнікі Малоткавіцкай школы, дзядуля запрагаў калгаснага коніка і прывозіў Валю ў школу. Нам таксама шанцавала ў гэты дзень, бо і мы пад'язджалі разам з імі. Настаўнікі ставіліся да яе прыхільна, перадавалі школьнікамі з нашай вёскі ўсё, што было ёй вельмі патрэбна. Пінскую завочную школу Валя скончыла з залатым медалём і без экзаменаў паступіла ў Брэсцкі педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна на філалагічны факультэт, рускае аддзяленне завочнай формы навучання. Тут ужо выкладчыкі інстытута ўсе пяць гадоў прыязджалі прымаць залікі і экзамены ў вёску, па чатыры-пяць чалавек адразу, але гэта не перашкаджала ёй здаваць усё толькі на выдатна.

У іх хаце на той час размяшчалася калгасная прафсаюзная бібліятэка, якой загадвала Валя. Чытачоў было многа. Дапамагаў Валянціне іх абслугоўваць яе брат Васіль. Тады ён ужо быў інвалідам на групе, абмежаваным у працаздольнасці. Каля іхняй сядзібы заўсёды, як цяпер кажуць, тусавалася моладзь і старэйшыя аднавяскоўцы. А ў выхадныя дні і ў святы з самага ранку да позняга вечара было заўсёды весела.

Але хвароба Валі і яе брата была невылечнай і ўвесь час прагрэсіравала. Пасля атрымання дыплома Валя паступіла ў аспірантуру БГУ імя У. І. Леніна. Тады і задумалася аб тым, што ў вёсцы далей вучыцца немагчыма і стала дабівацца кватэры ў горадзе Пінску. Знайшліся добрыя людзі ва ўладзе, яны дапамаглі атрымаць трохпакаёвую кватэру з усімі выгодамі ў Пінску ў 1974 годзе. Мама Ева Аляксандраўна адразу ўладкавалася на працу на камбінат верхняга трыкатажу.

Васіль увесь час дапамагаў Валянціне, быў у яе практычна сакратаром-машыністкай. Усё, што пісала Валя ад рукі, Васіль друкаваў на пішучай машынцы.

Кандыдацкую дысертацыю абараніла ў 38 гадоў. Працавала ў Інстытуце літаратуры Акадэміі навук Беларусі навуковым супрацоўнікам у аддзеле літаратурных узаемасувязей. Сумяшчала сваю працу ў Брэсцкім педінстытуце імя А. С. Пушкіна. Курыравала напісанне курсавых і дыпломных студэнтаў-выпускнікоў, якія прыязджалі на абарону сваіх работ на кватэру Валянціны ў Пінск.

Пісала рэцэнзіі на творы беларускіх і рускіх пісьменнікаў і друкавалася ў рэспубліканскіх часопісах. Навуковай працы яна аддала больш за 20 гадоў.

Нягледзячы на напружанасць працоўнага дня, Валянціна з вялікай радасцю і любоўю сустракала гасцей у сваёй кватэры. Валянціна — чалавек з вялікім сэрцам, добрай душою. З усмешкай старалася прыняць кожнага, хто пераступаў парог іх дома. Зойдзеш да яе ў пакой і адчуваеш сябе як дома. Тут цябе сустрэнуць, абнімуць, чаем напояць, да сэрца прыгалубяць. І пачынаецца доўгая размова пра жыццё, пра мінулае, пра планы на будучае. Валя праяўляла сваю прыроджаную інтэлігентнасць, умела размаўляць і з малымі, і з юнакамі, і са старэйшымі людзьмі. А пры размове з начальствам праяўляла такую карэктнасць, што дзіву давалася, слухаючы яе размову. Прыкаваная да ложка каля 30 гадоў, яна не страціла сваёй мудрасці, чалавечнасці і таленту, любові да жыцця.

Задумы і мары Валянціны збыліся амаль усе. Але галоўная мара яе — выйсці замуж, мець дзетак, сям'ю — не збылася. Пры размове адзін на адзін Валя расказвала, што кавалеры ў яе жыцці сустракаліся, якія прапаноўвалі ёй выйсці замуж. Але так, мабыць, распарадзіўся Бог.

Асобна, самыя цёплыя словы неабходна сказаць пра маму Валянціны Еву Аляксандраўну. Яна не кінула сваіх дзетак, не здала іх у інтэрнат, а ўсю сваю мацярынскую любоў, усё сваё жыццё прысвяціла Валянціне і Васілю.

Рабіла Валя любую справу з вясёлым і шчырым гумарам, любіла людзей і ведала ім цану, для многіх яна была і сябрам, і сястрою. І мы любілі яе мяккі голас, яе неачарсцвелую душу, добрае сэрца.

Некалькі слоў хацелася б сказаць пра наша сяброўства з Валянцінай. Самымі блізкімі сяброўкамі былі мы ў дзяцінстве. Бегалі, весяліліся, вяночкі з дзьмухаўцоў і валошак плялі, хваліліся абновамі пад Вялікдзень, у каго чаравічкі прыгажэйшыя, у каго сукенка даражэйшая, чыя мама куліч смачнейшы спякла, чый бацька яек больш «выбіў». У школу хадзілі з палатнянымі торбачкамі, насілі кашулі, пашытыя з даматканага сукна. А потым — сярэдняя школа.

З нашай вёскі закончылі пачатковую школу у тым годзе толькі дзве дзяўчынкі: я (Аня) і Валя. І абедзьве марылі стаць настаўніцамі. З цягам часу сустрэчы рабіліся рэдкімі, у асноўным па выхадных днях. Не мінала я іхняй хаты, калі вучылася ў педвучылішчы ў Пінску. Абменьваліся навінамі, вучобай, расказвалі пра сваіх настаўнікаў. Пасля педвучылішча я паехала працаваць у Ляхавіцкі раён Брэсцкай вобласці настаўніцай пачатковых класаў. Затым я выйшла замуж. Спачатку з мужам наведвалі сям'ю Валі. У нас былі агульныя інтарэсы, бо муж мой таксама быў філолагам, я вучылася ў Брэсцкім педагагічным інстытуце. Мы расказвалі Валянціне пра свае настаўніцкія і сямейныя справы, а яна дзялілася сваімі дасягненнямі ў літаратуразнаўстве. Цікавымі размовы ў Валі былі з маім мужам, бо к таму часу муж здаў кандыдацкі мінімум пры ўніверсітэце на факультэце беларускай літаратуры, а Валя збіралася пастулаць у аспірантуру на факультэт беларускай літаратуры. А я вучылася ў Брэсце таксама на факультэце беларускай мовы і літаратуры. Абмяркоўвалі навіны з часопісаў, новыя выданні беларускіх пісьменнікаў.

Паколькі бацькі мае жылі ў вёсцы Цепянец, я з мужам і дзеткамі часта ездзіла ў госці да іх, мы стараліся па магчымасці наведаць і сям'ю Валянціны. Пры сустрэчы было відаць, што яна любіць дзетак. Дарыла ім сувеніры, частавала прысмакамі, умела размаўляць з імі, як з дарослымі. Праўда, у гэты час сустрэчы былі не такімі частымі, як раней. Але для размоў быў ўжо тады тэлефон, па якім маглі пагутарыць, падзяліцца навінамі літаратурнага і асабістага жыцця.

Пражыла Валянціна Іванаўна нялёгкае, але годнае жыццё.

Знайшла яна пастаянны свой прытулак на роднай зямельцы. Ціхенька жыла і ціха пакінула нас.

Вечная памяць ёй, вечны спакой!!! З любоўю і вялікай павагай аднакласніца і сяброўка Ганна Бажко (Вайшэвіч), ураджэнка вёскі Цепянец Пінскага раёна Брэсцкай вобласці.

*Май 2019 г.*